ISSN 0023–3102

# Беларуская ДУМКА

Белорусская мысль

5
2004



*Заснавальнік*
АДМІНІСТРАЦЫЯ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Выдаецца з кастрычніка 1991 г.

**5**
май




**ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ І ГРАМАДСКА-ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫ ЧАСОПІС**

У НУМАРЫ:


| | | |
|---|---|---|
| | **Величко В.** К тебе, Отчизна, припадаем, как припадал к земле Антей | 3 |
| | **Ковалев М.** От дискуссий — к действиям | 17 |
| | **Мохнач Г.** Строммашевский почерк | 23 |
| *ЭКАНОМІКА* | **Сауліч У.** Докшыцкае «дзіця» прыжылося ў вёсцы | 30 |
| *ПРАВА* | **Шейман В.** Организованная преступность: укрощение зла | 37 |
| *ЭЎРЫКА!* | По страницам зарубежных журналов | 44 |
| *УЛАДА* | **Липкин И.** Лекторы спешат к людям | 49 |
| *ФІЛАСОФІЯ І СУЧАСНАСЦЬ* | **Лепешко Б.** Феномен государственности | 57 |
| | **Юрчук Н., Монастырный П., Еровенко В.** О математике — с надеждой | 66 |
| *АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ* | **Вараб'ёў В.** Эвалюцыя інфармацыйнай прасторы | 72 |
| | **Марціновіч А.** Ліцэй — для адораных | 79 |
| *НАВУКА І ТЭХНАЛОГІІ* | **Сурдин В.** Тайна Марса | 88 |
| | **Гапоненко С.** Мир с приставкой *нано-* | 95 |
| *СОЦЫУМ: РАКУРСЫ І ГРАНІ* | **Яковлева Т.** Коса на камень | 101 |
| | **Жебит Г., Рыбка Д., Сташкевич О., Барабанов К.** О райских яблочках и золотой рыбке | 108 |
| | **Вішнеўскі А.** Мы — беларускі народ | 112 |
| *ДУХОЎНАСЦЬ* | Хватило бы духу сразиться со злом | 116 |
| | **Адливанкин И., Москаленко И.** Новое движение или новое нашествие? | 117 |
| *МОМАНТ ІСЦІНЫ* | **Шелехов М.** Чудо в Рожковке | 123 |
| *ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ* | **Иванов Ю.** «Поклонимся великим тем годам» | 137 |
| | **Селеня Е.** «С девочкой спасенной на руках...» | 147 |
| *ПЛАНЕТА І МЫ* | **Романовский Р.** Солидарность в интересах человечества | 152 |
| *ЛІТАРАТУРА І ЖЫЦЦЁ* | **Скоринкин А.** *Стихи* | 158 |
| | **Макарэвіч В.** Яблыкі. *Апавяданне* | 162 |

| | | |
|---|---|---|
| *КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ* | **Локун В.** Праз церні да дасканаласці | 165 |
| *СВЕТ МАСТАЦТВА* | **Ярмалінская В.** Разумныя казкі для маленькіх і дарослых | 172 |
| *СПОРТ І ЗДАРОЎЕ* | **Ломсадзе Л.** Новые радости Старых Дорог | 181 |
| | **Лісоўскі С.** Прыветныя вятры Раўбічаў | 187 |


Галоўны рэдактар У. П. ВЯЛІЧКА

*Рэдакцыйная калегія:*
У. П. Андрэйчанка, Г. А. Булыка, П. А. Вадап'янаў, А. П. Вайтовіч, С. Н. Князеў, А. А. Марціновіч, Г. А. Махнач, М. У. Мяснiковіч, А. В. Праляскоўскі, У. В. Русакевіч, А. Г. Слука, М. С. Сташкевіч, У. М. Шымаў, М. М. Шэлехаў, Л. М. Якавенка

*Тэлефоны рэдакцыі:*

галоўнага рэдактара — 232-13-24; першага намесніка галоўнага рэдактара — 232-13-36; намесніка галоўнага рэдактара — 287-16-54; прыёмнай — 232-12-94;

*аддзелаў:* філасофіі, гісторыі і міжнароднага жыцця — 287-18-91; дзяржаўнага будаўніцтва — 287-18-91; эканомікі — 287-19-88; навукі і тэхналогій — 287-16-54; экалогіі і медыцыны — 287-15-82; сацыяльных праблем і права — 287-15-82; адукацыі і маралі — 287-19-88; літаратуры і мастацтва — 232-13-36; мастацкага афармлення — 287-16-54; карэктарскай — 287-17-65; бухгалтэрыі — 287-17-88; факс — 287-17-88

Часопіс выходзіць на беларускай і рускай мовах у залежнасці ад мовы аўтарскага арыгінала. Аўтары апублікаваных матэрыялаў у адпаведнасці з Законам аб друку нясуць адказнасць за дакладнасць прыведзеных фактаў і звестак. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара. Рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Передрукоўванне дазваляецца па ўзгадненню з рэдакцыяй, спасылка на часопіс «Беларуская думка» абавязковая.

Мастацкі рэдактар Н. Ф. Альхоўская
Тэхнічны рэдактар Н. Я. Гарбар
Карэктары: Р. І. Акшэўская, Т. Ф. Архіпенка, Л. П. Жыткавец

Падпісана да друку 23.04.2004
Фармат 70x108[1]/[16]. Афсетны друк. Гарнітура Таймс. Папера афсетная
Умоўна-друк. арк. 16,8. Умоўн. фарбаадб. 17,2. Ул.-выд. арк. 20
Тыраж 4925 экз. Заказ 893. Цана ў розніцу — 1030 руб.

*Адрас рэдакцыі:* 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, праспект Францішка Скарыны, 79.

© «Беларуская думка», 2004



**Валянціна ЛОКУН**
Кандыдат філалагічных навук

# Праз церні да дасканаласці

## *Беларускі раман на пачатку XXI стагоддзя*

Талент мастацтва абавязкова ўключае ў сябе адчуванне часу гістарычнага і эстэтычнага. Талент і час паняцці ўзаемазвязаныя. Талент не дадаецца да пачуцця часу і жыццёвага вопыту творцы, ён выяўляецца ў адчуванні часу. Адчуванне гістарычнага і эстэтычнага часу ёсць адна з уласцівасцяў творчай асобы. «Кожны з нас,— адзначыў Олдас Хакслі,— нараджаецца ў пэўнай культурнай прасторы і ўсё сваё жыццё не выходзіць за яе межы» [1].

Зрухі, што адбыліся ў грамадска-палітычным жыцці напрыканцы мінулага стагоддзя, не маглі не адбіцца на літаратурным працэсе. Беларускі раман як мастацкая, паўнавартасная форма эпічнага, па-філасофску заглыбленага адлюстравання жыцця таксама прайшоў праз свае церні, супярэчнасці і нават крызіс.

Пачатак XXI ст. стаў часам актывізацыі жанру рамана. У 2000 г. былі надрукаваны раманы У. Гніламёдава «Уліс з Прускі», І. Шамякіна «Губернатар», В. Казько «Бунт незапатрабаванага праху». 2001 год пазначаны раманам А. Дзятлава «Над безданню». (Калі некага прапусціла, няхай прабачыць.) У 2002 г. убачылі свет раманы В. Коўтун «Пакліканыя» і М. Кусянкова «Хмель каля вольхі» (працяг цыкла «Явар і каліна», «Арлюк і зязюля»). У 2003 г. адбыўся сапраўдны «ўзрыў» рамана. Адразу з'явілася ў друку больш за дзесятак грунтоўных твораў: У. Гніламёдаў «Усход», А. Савіцкі «Пісьмо ў рай», В. Коўтун «Пакліканыя» (кні-

га другая), А. Наварыч «Літоўскі воўк» (атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» за 2003 год у галіне «Мастацкая літаратура»), А. Бутэвіч «Каралева не здраджвала каралю», М. Герчык «Оружие для убийцы», А. Казлоў «Мінск і воран, Парыж і здань», С. Зайцаў «Пепел и снег», Э. Скобелеў «Завещание Сталина», З. Дудзюк «Кола Сварога», В. Гапеева «Рэканструкцыя неба» і г. д.

Памкненне пісьменнікаў да глыбокага асэнсавання свету, пошукі новага героя і новых духоўных арыенціраў непазбежна прывялі да абнаўлення зместу рамана і яго выяўленчых сродкаў. З аднаго боку, ён абапіраецца на традыцыі рэалістычна-псіхалагічнай прозы, традыцый аналітычнага рамана, якія былі распрацаваны яшчэ пачынальнікамі беларускай прозы — М. Гарэцкім, З. Бядулем, К. Чорным і іх паслядоўнікамі І. Мележам і У. Караткевічам. З іншага — традыцыі еўрапейскай экзістэнцыяльнай, мадэрнісцкай і постмадэрнісцкай школы: Д. Джойса, А. Камю, Ж. Сартра. Разам з тым беларускі раман пачатку XXI ст. моцны сваім канкрэтна-гістарычным бытапісаннем. Ён узбагачаецца новымі рэаліямі: стала акрэсліваццa тэндэнцыя да ірацыянальнага апавядання (В. Казько), пісьма метафарычна-асацыятыўнага (А. Казлоў, А. Наварыч) і нават фантасмагарычнага — апошняе датычыць аповесці Т. Бондар «Пусты п'едэстал» і А. Бароўскага «Спакушэнне». Усё больш настойліва абазначаецца тэндэнцыя да шырокіх мастацкіх абагульненняў і тонкага псіхалагічнага малюнка (У. Гніламёдаў, В. Казько, В. Коўтун).

Айчынны раман канца XX і пачатку XXI ст., незалежна ад таго, які матэрыял ён даследуе, сучаснасць ці мінулае, гісторыю, вырашае найперш праблемы духоўнасці, праблемы нацыянальнага духу, адсюль і яго памкненне да філасафічнасці, да вырашэння «спрадвечных» паняццяў дабра і зла, любові і міласэрнасці. Усё больш актуальнымі з'яўляюцца праблемы хрысціянізацыі індывідуальнай і грамадскай свядомасці.

Імкнучыся перадаць дынаміку жыцця праз індывідуальныя лёсы, раманісты сталі больш уважлівымі да асобы чалавека, яе, асобы, маральнай і духоўнай сутнасці. У сувязі з гэтым, у структуры мастацкіх тэкстаў пераважае «плынь свядомасці», унутраны маналог.

## Ахвяра і драпежнік у адной абалонцы

«Плынь свядомасці» — дамінантны прынцып адлюстравання жыцця ў рамане В. Казько «Бунт незапатрабаванага праху». Гэты твор можна назваць этапным у самога пісьменніка, як было раней з яго аповесцю «Суд у Слабадзе» (1978) і раманам «Неруш» (1981). Аднак ён з'яўляецца этапным і ў развіцці ўсёй беларускай літаратуры канца XX ст. Гэта — вынік яе развіцця. Як была вынікам — і пачаткам таксама! — раманная творчасць Л. Талстога і Ф. Дастаеўскага для еўрапейскай. Як быў «пачаткам» «Уліс» Джэймса Джойса для сусветнай і гістарычны раман У. Караткевіча — для беларускай.

Яшчэ ў 1997 годзе П. Васючэнка «спрагназаваў» з'яўленне гэтага рамана В. Казько: «Агульны вектар творчасці празаіка бачыцца як рух да стварэння прозы новага кшталту, у якой выспявае пераход сікрэтызму ў сінтэтызм, аналітыкі і дыдактыкі ў канцэптуальнасць і філасофскасць»[2].

У рамане В. Казько знайшло сваё адлюстраванне мінулае стагоддзе, яго другая палова — час трагічны і бунтоўны адначасова. Пра бунтоўнасць сказаў сам В. Казько ў адным са сваіх інтэрв'ю: «Доўгі час я працую над раманам "Бунт незапатрабаванага праху". Гэта раман пра бунтоўнасць чалавечай натуры. Калісьці ў Сібіры мяне вельмі ўразілі закінутыя магілкі (былога Сіблага), дзе-нідзе трапляліся шыльдачкі: "Прах не востребован". Ніводны бунт не прынёс нічога добрага...»[3].

«Бунт незапатрабаванага праху» — раман шматпланавы не толькі таму, што ў ім паядноўваюцца падзеі, жыццёвыя з'явы, розныя па часе, геаграфіі, быцій-

най прасторы, а яшчэ і таму, што яго плынь размяшчаецца ў шматлікіх паэтычных планах. Адрэзкі апавядальныя і неапавядальныя, эпас і філасофія, «плынь свядомасці» і аўтарскае аб'ектываванае пісьмо, драматычныя сцэны і лірычныя маналогі, пейзажы і публіцыстыка.

Жыццё чалавека, паводле В. Казько, працякае па-за воляй самога чалавека. Так было і раней, так было спрадвечна, «халастое счапленне бясконца хуткіх імгненняў укручвае яго (чалавека.— *В. Л.*) у нейкія свае планетарныя касмічныя арэлі, спаражняе і замарожвае яго да абсалютнага нуля, касмічнага холаду і адзіноты, закладзенай, назапашанай ім загадзя, мо яшчэ да нараджэння, начыняе яго хлуснёй продкаў, а таксама і нашчадкаў, жывёльным страхам, што ідзе следам за кожным нованароджаным». Такім чынам, асоба чалавека — гэта «звяно» ў бясконцых планетарных «счапленнях». Чалавек — ахвяра сіл касмічных і сацыяльных адначасова, ён жыве ў асобнай «ячэйцы» сотаў, дзе плынь, рух, жыццё ідзе па крузе. А вакол «пуста — нічога і нікога». Пуста і ўнутры чалавека, «драпежнік, монстр у галаве і сэрцы, за плячыма і на плячах».

Герой адкрыў для сябе страшную ісціну. Ён — не чалавек. Ён — монстр. Ахвяра і драпежнік у адной абалонцы. Але гэта «яго найвялікшая таямніца. Тайна да страты прытомнасці, горкая і салодкая,— смяротная...» Праз гэтую тайну герой і аддаліўся ад людзей, сяброў, нават ад жонкі.

Герман Говар, галоўны герой рамана, як і колішні Колька Лецечка («Суд у Слабадзе»), прагнуў дазнацца, «хто ён ёсць, яго “ху”», хацеў і адначасова баяўся ведаць праўду пра сябе. І ён збег, схаваўся ад людзей і жонкі «ў зморак і завейную сцюжу Запаляр'я». Там жа, сярод такіх, як сам, ён упершыню і пачуў: «— Ты монстр!».

Чалавек выпаў са спрадвечнай духоўнай еднасці са светам. «Нешта незлучальнае было паміж сінімі снягамі, што стагоддзямі ядналі сваё святло з паўночным ззяннем, і нецярплівай мітуслівасцю чалавека, які імкнуўся таксама дадаць нешта сваё ў гэтае ззянне». Паміж імі ўтварылася «бездань, параўнальная з вечнасцю». Бездань гэтая ўсё пашыралася. Чалавек канчаткова ўпэўніўся, што «вялікай неабходнасці ў ім гэты свет не ведае». І гэта была не толькі яго, чалавека, асабістая драма, а і драма свету.

Чалавеку за ўсё даводзіцца плаціць. Нават калі рахункі і грахі не яго, а чужыя. Хоць і яго таксама, бо яго дух, душа не мае пачатку і канца, яна была раней, з самага пачатку, і будзе, растворыцца ў космасе пасля, калі ён пакіне жыццё зямное.

Адбылося раздваенне асобы чалавека: адно «я» — монстравае, другое «я» — ахвярнае. Чалавеку-монстру няма выйсця «з гэтых чатырох сцен», бо «ўсюды адно і тое», а «вакол яго на светлавыя гады, да бясконцасці прасцёрта адзінота». Такой жа адзінокай засталася сама зямля, пакінутая Богам і знявечаная людзьмі. Яна таксама, разам з чалавекам, зайшлася ў стогне і плачы, бо таксама безабаронная, «як сабака на ланцуту, як вавёрка ў коле».

Сышліся ява і фантасмагорыя, людзі і монстры — змяшаўся ўвесь белы свет, «без Адама і Евы, без яблыні і яблыка». В. Казько адмаўляе дзень сённяшні, але ж і мінулае — таксама спрэс разбурэнне, «прастытуцыя душы».

Страціўшы сваё «я», чалавек страціў духоўную сувязь з мінулым, адмовіўся ад каранёў. Перарываецца сувязь зямлі і космасу. Прах бацькоў застаўся незапатрабаваным. Сапраўдны монстр XX ст. без каранёў з'явіўся на гэтай зямлі і нідзе на ёй не ўкараніўся. «Зона, зона была на пачатку яго шляху, зона і напрыканцы, калючы дрот».

Але фінал рамана прасякнуты ідэяй аднаўлення духоўнага суладдзя зямлі і неба, ідэяй паяднання таго і гэтага светаў праз аднаўленне Дома — мікра- і макра-,— праз аднаўленне «калыскі», яблыневага саду, праз яднальную ідэю ўваскрэсення Хрыста. Толькі праз гэта застаецца надзея: «На старажытнай слыннай зямлі Турава-Пінскага княства ўжо ўбіралася ў сілу трэцяе тысячагод-

дзе ад Нараджэння Хрыстова. Была вербная нядзеля, а праз тыдзень — Вялікдзень». Дзень уваскрэсення Хрыста — дзень уваскрэсення Чалавека.

«Бунт незапатрабаванага праху» — гэта раман-біяграфія пакалення савецкіх часоў, апуканага пакалення.

## Што ні пакаленне — свае праблемы

В. Праўдзін («Нелюбімыя гінуць») і М. Герчык («Оружие для убийцы») імкнуцца адлюстраваць жыццё сучаснае, стварыць мастацкую біяграфію постсавецкага пакалення, пакалення «акул» (М. Герчык) і пакалення чачэнскай вайны, пакалення «ахвяр», «забітага» або «згубленага» пакалення (В. Праўдзін).

В. Праўдзін вельмі чуйны да маральных праблем сучаснага жыцця. Ён стварае свой вобраз часу — складаны, супярэчлівы, драматычны. Канцэнтрацыя чалавечага і народнага болю ў творы настолькі вялікая, што ўзнікае адчуванне непазбежнасці катастрофы.

Трагізм індывідуальнага лёсу (вобразы Айшэ, Любы Анікейчык і Івана Серады) праецыруецца на драму агульнанародную. Нібыта ўвесь свет паўстаў супраць чалавека і чалавек пайшоў на чалавека.

Трагедыя беларускай вёскі, якая масава спілася і праз гэта маральна дэградавала, дапаўняецца вялікай трагедыяй чачэнскага народа. Карані гэтай трагедыі цягнуцца яшчэ да сталінскай палітыкі генацыду супраць яго.

Раман В. Праўдзіна шматгеройны, шматпланавы, структурна складаны, з шэрагам аўтаномных апавядальных ліній, сюжэтна разгалінаваны, часам нават празмерна.

У жанры псіхалагічна-аналітычнай прозы піша і М. Герчык. Ён стварыў свой кампактны тып рамана, дзе дзея сканцэнтравана вакол аднаго «геаграфічнага цэнтра» — выдавецтва «Афрадыта». У творы шмат драматычных сітуацый. Стыль апавядання лаканічны.

М. Герчык, як В. Казько, В. Праўдзін, М. Кусянкоў, пісьменнік драматычнага плана. Пра гэта сведчыць і яго папярэдняя аповесць «...А человек играет на трубе», у цэнтры якой — лёс былога франтавіка, цяжкі, незвычайны, трагічны. У аповесці пісьменнік ставіў перад сабою задачу: прасачыць, як чалавек-ахвяра паступова ператвараецца ў монстра. Толькі адчуванне «монстравасці» яшчэ больш паглыбіла ўнутраную трагедыю героя.

«В нашем обществе,— заўважыў А. Казлоў,— формируется тип человека западной морали. Запоздало, болезненно, с определенными мутациями, но рождается белорус-акула»[4]. Адным з першых адкрыў гэты тып І. Шамякін (аповесці «Падзенне», «Выкармак»). Толькі «беларус-акула» мае сваю асаблівасць — нацыянальную, анталагічную, генную — ён не існуе ў беларускай літаратуры ў «чыстым» выглядзе. Гэта — монстр і ахвяра ў адной асобе. (Праўда, калі звярнуцца да вопыту Ф. Дастаеўскага, да «першавытоку», дык можна гаварыць пра славянскае паходжанне «двуадзінства» асобы чалавека.)

М. Герчык у рамане «Оружие для убийцы», у параўнанні з І. Шамякіным, даследуе ўжо не асобнага чалавека-акулу, ён даследуе **пакаленне** акул. Пакаленне вінаваўцаў і ахвяр адначасова. І вінаваўцаў і ахвяр **па сваёй волі**. У гэтым істотная розніца паміж героем В. Казько, свабода якога была абмежавана ідэалагічнымі і ўсялякімі іншымі «нарматывамі», і героем В. Праўдзіна, які быў таксама несвабодны ў сваім выбары.

М. Герчык адлюстраваў пакаленне «монстраў», якія свой шлях абралі самі. Гэта ніцшэнскі тып чалавека. Ён не мае перспектывы свайго існавання ў сучасных умовах. Менавіта «монстравасць» і прыводзіць герояў М. Герчыка да ўнутранай трагедыі, унутранага разладу з людзьмі і светам.

«За что караешь, Господи?» — ставіць слушнае пытанне адзін з герояў рамана М. Герчыка. Адказ гучыць з вуснаў старой жанчыны: «Господь долго приме-

рает, да больно бьет». Усе мы вінаватыя, што адракліся ад галоўнага свайго Сумлення, вінаватыя за той колішні касцёр, у якім паліліся іконы, вінаватыя, што дапусцілі здзек над нятленным. За гэта мы праклятыя. «Всем воздастся по заслугам». Такі вынік духоўных пошукаў прозы М. Герчыка.

## Ідэалы, якім не суджана было збыцца

Твор А. Савіцкага «Пісьмо ў рай» таксама можна аднесці да рамана-біяграфіі — «сацыяльнай» біяграфіі сталінскіх часоў. Але раман А. Савіцкага гэта яшчэ і раман-споведзь, раман-«маленне». Споведзь я-героя перад сваім бацькам, які загінуў у адным з сібірскіх ГУЛАГаў. Споведзь-малітва, якую герой адсылае бацьку ў рай, бо верыць, што бацька там — у раі: «Пекла ты адбыў тут, на зямлі. А двойчы туды... трапіць немагчыма».

Герой А. Савіцкага вяртаецца ў дні свайго маленства, юнацтва дзеля таго, каб зразумець нешта істотнае для сябе, зразумець, спасцігнуць таямніцу веры свайго бацькі — трагічную па сутнасці веру.

Сталінізм паводле А. Савіцкага — гэта вера. Вера ў ідэалы, якім не суджана было збыцца, вера ў ілюзію, якая так і не стала явaю. Акрамя гэтага, сталінізм яшчэ і Сістэма, якая развіваецца па сваіх непахісных законах, хоць яна і рукатворная. Усе, хто быў уцягнуты ў сферу дзейнасці гэтай Сістэмы, былі яе ахвярамі. Нават Сталін, галоўны канструктар і натхніцель Сістэмы, таксама залежаў ад яе. «Мы,— чытаем у дзённіку начлага Зубава,— закладнікі, але ж і ён, у сваю чаргу,— наш закладнічак. І тут ні мы... ні наш родны Правадыр і Настаўнік нічога змяніць не ў стане: сіла, што арудуе ў яго пад носам, яму ўжо непадуладная».

Хада гісторыі, сцвярджае Савіцкі,— працэс аб'ектыўны. Чалавек не можа на яго ўплываць, яго задача — захаваць мінулае ў сваёй памяці такім, як яно было, без крытыкі і гвалту над ім. Толькі праз памяць пра сваіх продкаў чалавек забяспечвае сабе будучыню. Захаванне памяці, лічыць пісьменнік, ёсць адказнасць перад будучыняй, чалавек без памяці стаіць па-за гістарычнай перспектывай.

Новыя тэндэнцыі развіцця нацыянальнай раманістыкі перш за ўсё закранаюць творы, якія прысвечаны сучаснасці, але ў пэўнай ступені гэта можна сказаць і пра раман гістарычны — пра што сведчаць творы В. Коўтун «Пакліканыя», У. Гніламёдава «Уліс з Прускі» і «Усход», А. Бутэвіча «Каралева не здраджвала каралю», А. Наварыча «Літоўскі воўк», С. Зайцава «Пепел и снег». Усе яны пазначаны асаблівай аўтарскай цікавасцю да праблемы нацыянальнага духу.

## Пакліканая, але і выбраная

«Мадыфікаваную» стылістыку «плыні свядомасці» выкарыстоўвае В. Коўтун у рамане «Пакліканыя» (выйшлі першыя дзве кніжкі). Аўтар натуральна сумяшчае мінулае і сённяшняе жыццё сваіх герояў, свабодна, на аснове асацыятыўнага прынцыпу, мяняючы часавую і геаграфічную прастору.

Прозу В. Коўтун таксама можна аднесці да інтэлектуальнай: настолькі моцны тут філасофскі пачатак, глыбіня думкі. Пісьменніца спасцігае філасофію гісторыі праз спасціжэнне індывідуальнага высокага духу. Яна вылучае ідэю хрысціянскай этычнай духоўнасці як адну з галоўных у працэсе гісторыка-культурнага фарміравання нацыянальных гуманістычных каштоўнасцей.

Заглыблена, праз мноства побытавых дэталяў пададзены «вобраз» часу — складанага, супярэчлівага, драматычнага. Працэс хрысціянізацыі славянскіх народаў быў драматычны. Паганская вера не адступалася, лілася кроў нявінных людзей, чыніліся жорсткасць і насілле. І чым больш мацнела хрысціянская ве-

ра, барацьба паміж Полацкам, Ноўгарадам і Кіевам за вярхоўную княжацкую ўладу рабілася ўсё больш жорсткай і бязлітаснай. Дванаццатае стагоддзе пачыналася «трывожна і неміласэрна». Пісьменніца паядноўвае ў адно мастацкае цэлае эпіку жыцця і аналітыку індывідуальных лёсаў — велічных і трагічных адначасова. Узнікае панарамны малюнак нацыянальнага быцця.

Жыццё на зямлі полацкай пададзена праз успаміны галоўнай гераіні твора Еўфрасінні Полацкай. Гэта яна, ігуменія, напрыканцы свайго працяглага манаскага жыцця, апынуўшыся на святой зямлі Галілеі, просіць у таго, каму амаль усё жыццё аддана служыла, дазволу «пусціць кола памяці праз жыццёвы круг». Бо нават там, у далёкай Галілеі, «відзежы памяці ставалі амаль відочнымі. Родная вотчына не адпускала». Структуру рамана, такім чынам, вызначае прысутнасць як бы двух апавядальнікаў — аўтаркі і яе гераіні. Гэта дазваляе пісьменніцы даследаваць «прадмет» з розных пунктаў гледжання, узаемадапаўняльна, свабодна змяняць інтанацыю апавядання — ад інтымнай споведзі да аб'ектыўнага аналізу ўчынкаў і падзей.

Апавядальная плынь рамана зменлівая: то спакойная і павольная, то вогненна-выбуховая. Яна — віруе, уцягваючы ў сябе ўсё новыя часавыя і прасторавыя сферы, сінтэзуючы жыццё рэальнае, рацыянальнае і ірацыянальнае, трызненні, відзежы. Апошнія натуральна ўваходзяць у зямное жыццё гераіні. Яны, да ўсяго, з'яўляюцца важкімі элементамі структуры вобраза гераіні.

Катэгорыя зла, яе дачыненне з катэгорыяй улады, нароўні з тэмай Еўфрасінні Полацкай,— галоўны даследчы клопат В. Коўтун. Пісьменніцу цікавіць катэгорыя ўлады як катэгорыя маральна-філасофская. Кіеўскі князь Мсціслаў, апярэдзіўшы смалян і полаўцаў, рушыў на Полацк, нібыта «сам іспра з пекла вылез і ўсё перавярнуў на свеце». Крывіцкая зямля была ўсеяна акрываўленымі ратнікамі Рагвалода і Давыда. Зло стала татальным, усюдыісным, яно, гэтае сацыяльнае зло, стала страшнейшым за чуму, хваробу цялесную, якая тады таксама была распаўсюджанай. Такім чынам, улада, паводле В. Коўтун, зло. Абсалютнае зло. Перагортваючы адну за адной старонкі крывавых бітваў за княжацкі сталец, пісьменніца імкнецца высветліць тую вялікую таямніцу, якую тоіць у сабе «д'ябальская спакуса ўлады і ўсялякая магчымасць быць мацней за іншага чалавека. І мацней настолькі, што можна нават забраць у таго дар Боскі — жыццё».

Улада, лічыць гераіня В. Коўтун, ёсць слабасць плоці, д'ябальская спакуса славы. Толькі «слава зямная — прах і попел. Знікае, як падманная пара... І горш павуціння аблытвае людзей. Слабасць плоці часам мацней за сілу духу».

Свет можа ўратавацца толькі праз такія безумоўныя маральна-этычныя імператывы, як ветхазаветнае «не забі» і евангельскае «не супраціўляйся злу». Толькі любоў можа супрацьстаяць злу — любоў да Бога як найвышэйшая духоўная субстанцыя, «ласкаю Божаю напоўнена зямля. Любоўю ягонаю... Як і кожны з нас».

Характар Еўфрасінні Полацкай — спрэс проціборства зямнога і духоўнага. Зямное, цялеснае моцна прыцягвала гераіню, але яна ўparта адмаўлялася ад усіх радасцей зямных, бо «іншае маю здабыць». Яна нібыта ўбірала ў сябе «Душу Свету» (Пауло Коэлью) і сама станавілася часткаю гэтай Душы. Яна злілася з духам роднай зямлі і неба, травой і дрэвамі. Яны сталі «раўнавартаснымі». Еўфрасінія чула боль людзей, жывых і нават памерлых. І гэты востры боль станавіўся яе ўласным болем. Ён паласаваў яе цела ўсё мацней і мацней, а яна прасіла ў свайго Абранніка Нябеснага ўсё новых і новых выпрабаванняў — менавіта ў іх бачыла сваё і ўсяго роду чалавечага ратаванне. «Чалавек пачынае па-сапраўднаму бачыць і чуць толькі тады, калі слых і зрок падымаюцца да горніх вяршыняў».

Еўфрасінія Полацкая — вобраз сакральны ў беларускай літаратуры (калі разумець пад сакральнасцю якасць, якая валодае абавязковым станоўчым мараль-

ным зместам). Нароўні з вобразамі Міхала («Новая зямля» Я. Коласа), Васіля Дзятліка («Палеская хроніка» І. Мележа), Сцепаніды Багацька («Знак бяды» В. Быкава). В. Коўтун прапануе «мадэль» беларускага хранатопа, які мае сваю сістэму каштоўнаснага вымярэння,— абсалютная арыентацыя на хрысціянскае светаадчуванне, калі быццё і небыццё ўспрымаецца як манада ў манадзе.

Еўфрасіння Полацкая — асоба адраджэнскага кшталту. З шэрагу сусветна вядомых: Скарына, Будны, Цётка... Яны — пакліканыя. Еўфрасіння Полацкая не толькі «пакліканая», але і «выбраная».

■

Пачатак XXI ст. пазначаны ўсплёскам інтэлектуальнага рамана на новым, больш складаным — філасофскім — этапе яго развіцця. Гэтая жанравая форма ўсё больш збліжаецца з вопытам еўрапейскага рамана, з вопытам літаратуры «згубленага пакалення і экзістэнцыяльнай літаратурай: матыў духоўнай незапатрабаванасці, маральнай страчанасці чалавека, настрой касмічнай адзіноты» (В. Казько «Бунт незапатрабаванага праху», В. Праўдзін «Нелюбімыя гінуць», А. Казлоў «Мінск і воран, Парыж і здань»). Усё больш папулярнай, асабліва сярод пісьменнікаў постсавецкага часу, становіцца проза постмадэрнісцкага кшталту, з яе арыентацыяй на пісьмо метафарызаванае, асацыятыўнае, ірацыянальнае. Раманісты выкарыстоўваюць умоўныя мадэльныя сітуацыі, уводзяць дэталі-матывы, якія ў апавядальнай тэкставай прасторы набываюць сімвалічны сэнс (А. Казлоў «Мінск і воран, Парыж і здань» і ў меншай ступені А. Наварыч «Літоўскі воўк»).

Беларускі раман пачатку XXI ст. паядноўвае і сінтэзуе розныя па жанру і віду раманы — раман-біяграфія, раман-успамін, раман-партрэт. Ствараецца новы тып рамана — раман часу, раман гісторыі, у якіх індывідуальна-канкрэтнае становіцца агульным, а агульнае канкрэтызуецца да індывідуальнага. Беларуская літаратура займела раман, які вобразна паказвае сутнасць нацыянальнай культуры ў яе агульначалавечым значэнні.

П і н с к

ЛІТАРАТУРА

[1] Х а к с л і  О л д а с. Культура і асоба. // Крыніца. 2001. № 6. С. 86.
[2] В а с ю ч э н к а  П. Крыж пакутаў і памяці. // Полымя. 1997. № 2. С. 286.
[3] Звязда. 13 студзеня 2001 года. С. 5.
[4] Гл. дыскусію: Современная белорусская проза: время и герой. // Неман. 2003. № 3. С. 170.